**Веліч Маркса заключаецца ў тым, што ён даў адказы на пытанні, якія былі пастаўлены ў парадак дня ўсім ходам гістарычнага развіцця. Маркс здзейсніў найвялікшы пераварот у грамадскай свядомасці чалавецтва, выпрацаваў навуковы светапогляд пралетарыяту, які правільна адлюстроўвае законы гістарычнага развіцця. Ён ператварыў сацыялізм з утопіі ў навуку, абгрунтаваў немінучасць гібелі капіталізма і перамогі камунізма. К. Маркс узброіў рабочы клас разуменнем яго гістарычнай місіі, як магільшчыка эксплуататарскага ладу і творца сацыялістычнага грамадства, указаў шляхі злучэння рэвалюцыйнай тэорыі з масавым рабочым рухам.**

*(З Тэзісаў Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС да 150-годдзя з дня нараджэння К. Маркса).*

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 14 (705) · Пятніца · 12 красавіка 1968 г. · Цана 2 кап. · Год выдання XXI

# МАРКСУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

У гэтыя дні ўвагу наведвальнікаў чытальнай залы універсітэцкай бібліятэкі прыцягвае кніжная выстаўка, прысвечаная заснавальніку навуковага камунізма К. Марксу. Работнікі бібліятэкі адшукалі ў фондах найбольш цікавыя выданні твораў К. Маркса, падабралі літаратуру, якая адлюстроўвае пераможнае шэсце марксізма, расказвае аб жыццёвым шляху і сям'і Маркса, аб яго моцным сяброўстве з баявым паплечнікам Фрыдрыхам Энгельсам.

З хваляваннем перагортваем пажоўклыя старонкі «Капітала» 1885 года выдання, твораў геніяльнага мысліцеля, выдадзеных у Расіі ў 1905, 1913, 1919 гадах.

«Выбраныя творы», «Філасофія гісторыі», «Збор гістарычных работ», «Выбраныя творы», якія выйшлі ў 1935 годзе ў Мінскім партыйным выдавецтве. Побач сучасныя, выдатна афармленыя выданні твораў Карла Маркса.

Асобны раздзел складаюць кнігі, прысвечаныя жыццю Маркса: «З успамінаў аб Марксе», «Маркс. Гісторыя яго жыцця» Ф. Мерынга, «К. Маркс» Г. Серабраковай.

Тут мы бачым партрэты дочак Маркса, кнігу К. Вінаградскай «Жэні Маркс».

Выстаўка дапаможа лепш пазнаёміцца з вялікай спадчынай правадыра пралетарыяту ўсіх краін.

А. САКОВІЧ.



# У ГАСЦІННАЙ КРАІНЕ

*Група студэнтаў-філолагаў нашага універсітэта ў складзе пяці чалавек вярнулася з ГДР, са студэнцкай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння М. Горкага. Канферэнцыя праходзіла 18 сакавіка ў горадзе Іене, дзе знаходзіцца адзін з найбольш старажытных універсітэтаў Еўропы — універсітэт імя Ф. Шылера. Беларускія студэнты былі там па запрашэнню Іенскага інстытута славістыкі.*

*Усе мы—В. Саладоўнікаў, Г. Шмыгіна, Т. Баганік, аўтар гэтых радкоў і аспірант Д. Федараў выступілі на канферэнцыі з дакладамі, якія былі цёпла прыняты нямецкімі таварышамі. Пасля дакладаў разгарнулася ажыўленая дыскусія па многіх пытаннях: праблема героя ў творчасці Горкага, раман «Маці», п'есы пісьменніка. Вельмі актыўна рэагавалі нямецкія студэнты на выступленні ў дыскусіі прадстаўнікоў нашага універсітэта. Горача абмярkoўвалася пытанне аб выкладанні твораў пралетарскага пісьменніка ў школе.*

*Канферэнцыя прайшла арганізавана і вельмі актыўна. Акрамя нашых студэнтаў і студэнтаў з Тбілісі, на ёй выступілі прадстаўнікі многіх гарадоў ГДР. Канферэнцыя паказала, што М. Горкі карыстаецца шырокай папулярнасцю не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой, і, у прыватнасці, у ГДР; творчасць яго шырока вывучаецца нямецкімі студэнтамі, глыбока хвалюе іх, выклікае ажыўленыя дыскусіі, заклікае вывучаць іх вялікую рускую мову.*

*Пасля канферэнцыі нямецкія сябры арганізавалі для беларускіх і грузінскіх гасцей экскурсію ў горад Веймар, у Бухенвальд. Адбыліся гутаркі з доктарам Грундлерам, з сакратаром маладзёжнай арганізацыі універсітэта, на якіх абмяркоўваліся пытанні вучобы і жыцця студэнтаў нашага і іенскага універсітэтаў. У абедзвюх гутарках удзельнічалі студэнты Інстытута славістыкі, якія прыедуць у канцы красавіка на практыку ў Мінск.*

*Мы былі запрошаны ў гарадскі оперны тэатр, у мясцовы філагенетычны музей, на выстаўку вырабаў аднаго з буйнейшых у свеце заводаў аптычнага шкла — завода Цэйса. Адзін дзень мы знаёміліся са сталіцай ГДР горадам Берлінам, пабывалі ў Трэптаў-парку, дзе ўстаноўлена вядомая скульптура Вучэціча савецкаму воіну-вызваліцелю, ля Брандэнбургскіх варот, каля магіл Гегеля, Бехера, Брэхта, у берлінскім музеі.*

*Нашы гутаркі і сустрэчы з нямецкімі студэнтамі і прафесарамі надоўга застануцца ў нашых сэрцах як сімвал дружбы паміж нашымі народамі.*

*Б. ПЛОТНІКАЎ, студэнт IV курса філфака.*

**На здымку:** нашы студэнты ў гасцях у нямецкіх сяброў.

Фота **В. Саладоўнікава.**

СЕННЯ—ДЗЕНЬ КАСМАНАЎТЫКІ

# ПОДЗВІГ НАРОДА

**Зусім нямнога ён не дажыў да Дня Касманаўтыкі—дня старта свайго бессмяроцця, трыумфальнага палёту ў космас.**

**Сем год назад, 12 красавіка 1961 года, пачаўся першы касмічны рэйс грамадзяніна Савецкага Саюза Юрыя Гагарына, подзвіг якога зацвердзіў свята ўсяго чалавецтва, уступіўшага ў звёздную эру свайго існавання.**

**Сто восем мінут, на працягу якіх адбываўся бяспрыкладны палёт касмічнага карабля «УСХОД» вакол зямнога шара, увасобілі ў сабе традыцыі савецкага народа, гісторыю нашай Радзімы. За гэтымі кароткімі мінутамі—трагічны лёс прыгаворанага да смерці рэвалюцыянера Мікалая Кібальчыча, які рыхтаваў у сырым засценку Петрапаўлаўскага каземата праект новага лятаючага апарата, бяссонныя ночы геніяльнага самавучкі Канстанціна Цыялкоўскага, які прысвяціў сваё жыццё звёзднай мары чалавецтва, арыгінальныя формулы і разлікі таленавітага Юрыя Кандрацюка, які загінуў смерцю храбрых, абараняючы сталіцу сваёй Радзімы ў радах Народнага апалчэння...**

**Не пералічыць імёны таленавітых падзвіжнікаў касманаўтыкі, самавучак і вучоных, умельцаў і інжынераў—першапраходцаў касмічнай цаліны, людзей вялікай нашай славы. За імі — увесь савецкі народ, уся наша краіна, першай уступіўшая ў эпоху сацыялізма і першай паслаўшая сына свайго ў касмічны палёт.**

**Першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, першая ў свеце касмічная ракета, першыя міжпланетныя станцыі «Месяц-2», «Месяц-3»... І вось зноў увесь свет абляцела вестка аб запуску ў Савецкім Саюзе новага чырвоназвёзднага разведчыка Месяца. Крок за крокам, этап за этапам працягваецца штурм Месяца. Навуковыя даследаванні калямесячнага прастору і паверхні Месяца адкрываюць далейшыя перспектывы для вывучэння і засваення чалавецтвам прастораў Сусвету.**

**Паспяхова пачалося вывучэнне Марса і Венеры. Успомніце «ювелірную» дакладнасць, з якой здзейснен палёт аўтаматычнай станцыі «Венера-3». На адлегласці ў 12 мільёнаў 900 тысяч кіламетраў ад нашай планеты па сігналу з Зямлі станцыя зрабіла складаны манеўр, які забяспечыў пападанне ў цэнтральны раён Венеры ў такі час, калі яна была ў зоне бачнасці савецкіх станцый назірання.**

**Наперадзе—далейшае пранікненне ў космас для паглыблення нашых ведаў аб структуры рэчыва, аб эвалюцыі жывой матэрыі, якія неабходны для вырашэння многіх задач на Зямлі. Вырашэнне комплексу такіх складаных задач пад сілу толькі дзяржаве з высокім навукова-тэхнічным патэнцыялам і самым перадавым грамадскім ладам. Такой дзяржавай з'яўляецца наш Савецкі Саюз.**

М. РЭЗНІКАЎ, дацэнт.

## НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ БССР І КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

# ПАД КАНТРОЛЕМ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

**Партыйнае бюро факультэта журналістыкі абмеркавала работу камітэта камсамола. Сакратар В. Пішчык расказаў аб вучэбна - выхаваўчай дзейнасці, і, у прыватнасці, патрыятычным выхаванні моладзі. Шмат зроблена ў гэтай галіне. Толькі ў першым семестры адбылося 22 сустрэчы са старэйшымі камуністамі, вядомымі пісьменнікамі і журналістамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.**

**Камітэт камсамола прыняў канкрэтныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя БССР, Кампартыі рэспублікі і 50-годдзя ленінскага камсамола. Маладыя даследчыкі, члены СНТ, падрыхтуюць да гэтых знамянальных дат каля 10 дакладаў па гісторыі камсамола Беларусі. Шэраг студэнцкіх работ прысвячаецца гісторыі стварэння ў рэспубліцы маладзёжных газет. На факультэце адбудзецца спецыяльная студэнцкая канферэнцыя па пытаннях друку і рабселькораўскага руху, будзе выдадзен альманах аб вядомых журналістах рэспублікі.**

**Займаючыся гэтымі справамі, камітэт не забывае аб вучобе студэнтаў, паўсядзённа вядзе індывідуальную работу, арганізуе рэйдавыя праверкі наведвання лекцый, высвятляе прычыны пропускаў заняткаў.**

**Аднак партыйнае бюро адзначыла, што гэтая работа не даводзіцца да канца. Вынікі праверак, вывады камісій не абмяркоўваюцца на пасяджэннях камітэта.**

**Цяпер студэнты журфака пачалі рыхтавацца да Дня друку. Да яго будзе прымеркаваны традыцыйны вечар сустрэчы журналістаў розных выпускаў. Створана спецыяльная камісія па правядзенню традыцыйнага свята газетчыкаў.**

**С. ІВАНОЎ.**



Валянціна Савенка — дыпломніца геолага-геаграфічнага факультэта—абрала тэму: «Развіццё эрозіі яраў на тэрыторыі калгаса «Бальшавік» Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці». Цяпер яна ўжо закончыла працу над дыпломнай і рыхтуецца да абароны.

Фота І. АСКІРКІ.

# ЗА КРУГЛЫМ СТАЛОМ СТУДЭНТЫ І ВЫКЛАДЧЫКІ

Вышэйшая школа прызвана ўзбройваць студэнцкую моладзь не толькі глыбокімі і дасканалымі ведамі, але і фарміраваць у іх навуковы светапогляд. Вялікая роля ў вырашэнні гэтай важнай задачы належыць пазавучэбным мерапрыемствам, цэламу комплексу форм і метадаў выхаваўчай работы. Аб адной з гэтых форм,—вечарах пытанняў і адказаў, — аб яе значнасці і эфектыўнасці і расказваецца на гэтай старонцы.

Публікуючы гэты матэрыял, рэдакцыя просіць чытачоў прыняць жывы ўдзел ў абмеркаванні даволі важнага пытання—аб удасканаленні форм і метадаў усёй выхаваўчай работы, аб павышэнні іх змястоўнасці і дзейснасці. Абагуліць накоплены ў гэтай справе вопыт і ўзбагаціць яго новымі рысамі—такі сэнс пачатай размовы.





## ЗАЎСЁДЫ ЦІКАВА

Я ўдзельнічаю вось ужо другі год у сустрэчах нашай кафедры (марксісцка-ленінскай філасофіі) са студэнтамі, што жывуць у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова. Да гэтых сустрэч выкладчыкі рыхтуюць адказы на пытанні, загадзя пастаўленыя студэнтамі. І кожны раз я прыходжу да вываду, што іменна такая форма сустрэчы з'яўляецца найбольш плённай у тым сэнсе, што яна дае магчымасць выкладчыкам аказаць найбольш эфектыўнае ўздзеянне на студэнтаў.

Я маю на ўвазе, што пытанні на такіх вечарах не з'яўляюцца выпадковымі. Яны выяўляюць іменна тое, што цікавіць студэнтаў больш за ўсё. Кожны раз я пераконваўся, што студэнты ставяць перад выкладчыкамі даволі сур'ёзныя пытанні, якія звязаны з сучасным становішчам навукі і выклікаюць роздум у студэнтаў. У абставінах інтэрната, ды яшчэ на спецыяльным вечары студэнты могуць задаваць такія пытанні, якія не маглі задаць у час лекцыі, дзе яны ўсё ж звязаны пэўнай тэмай чытаемай лекцыі. Такім чынам, для студэнтаў гэтыя вечары даюць магчымасць атрымаць адказ на хвалюючыя іх пытанні, прытым ад выкладчыкаў, якія з'яўляюцца найбольш кампетэнтнымі ў даных праблемах. З другога боку, для выкладчыкаў такія вечары даюць магчымасць вывучыць запатрабаванні студэнтаў, прычым іменна ў пазалекцыйных абставінах, а гэта важна для таго, каб з улікам гэтых запатрабаванняў будаваць свае лекцыі.

Я думаю, што вопыт нашай кафедры ў гэтай галіне павінен быць успрыняты іншымі кафедрамі і распаўсюджан на іншыя інтэрнаты. Асабліва, як мне здаецца, такія вечары неабходна арганізаваць у інтэрнаце на Паркавай магістралі, дзе жыве вялікая колькасць студэнтаў розных факультэтаў.

Р. ЛЕВІН,
доктар філасофскіх навук.

## ДОМА, НА АГЕНЬЧЫКУ

*Рэпартаж*

Хваляванні арганізатараў вечара—збяруцца ці не збяруцца ў вызначаны час студэнты—былі дарэмнымі. Яшчэ задоўга да паяўлення «аўтарытэтных асоб», тых, хто павінен быў парыраваць шматлікія пытанні публікі, у ленпакоі нельга было знайсці свабоднага месца. Праз усе паверхі, па лесвічных клетках, уверх—уніз, снавалі з крэсламі студэнты. І кожны стараўся хоць як-небудзь, хоць адным бокам прасунуцца да запаветнага месца дыспутаў. А калі кампітэнтныя асобы з'явіліся, у ленпакоі недзе было ўпасці іголцы. Людзі стоўпіліся ў дзвярах. Вечар пытанняў і адказаў, як і заўсёды, абяцаў быць цікавым...

Кандыдат філасофскіх навук **Ю. А. Гусеў** (ён жа і адказны за мерапрыемства) зачытаў прысутным пытанні, якія былі загаддзя пастаўлены студэнтамі.

**Доктарская дысертацыя К. Маркса.** Высвятленню якіх філасофскіх праблем яна была прысвечана? Што агульнае і рознае ўгледзеў Маркс у філасофіі Эпікура і Дэмакрыта?. Ці сапраўды, як сцвярджаюць буржуазныя тэарэтыкі, паміж вучэннямі маладога і старога Маркса існуе глыбокая супярэчнасць? На ўсе гэтыя пытанні проста і пераканаўча адказвае кандыдат філасофскіх навук **Вера Анісімаўна Внукава.**

Тое, што пытанне, прысвечанае тэарэтычнай спадчыне Маркса, на вечары было пастаўлена першым,—не выпадкова. Гэта яшчэ раз сведчыць аб глыбокай зацікаўленасці нашага студэнцтва да заснавальніка навуковага камунізма, буйнага тэарэтыка і правадыра рэвалюцыйнага пралетарыята, 150-годдзе з дня нараджэння якога праз некаторы час будзе адзначаць усё прагрэсіўнае чалавецтва...

Другое пытанне, якое звязана з існаваннем кваркаў—субчасцінак, з якіх складаецца часцінка, пераносіць нас у галіну фізікі. Яго асвятляе кандыдат фізіка-матэматычных навук **Леў Мітрафанавіч Тамільчык.**

Якія праблемы стаяць перад фізікай элементарных часцінак? Як адкрыты пазітрон — антычасцінка, што ён сабой уяўляе? Усё гэта цікавіла не толькі фізікаў, але і ўсіх прысутных.

**Што такое эўрыстыка!**

Ці можна стварыць машыну, якая б была разумней за людзей?

Як чалавек адкрывае новае, невядомае? Які працэс адбываецца ў яго галаве?

**Эўрыстыка і кібернетыка. Знакі і знакавыя сістэмы, іх роля ў навуцы. Мова і мысленне.** На ўсе гэтыя і іншыя пытанні прышлося адказаць доктару філасофскіх навук **Рыгору Аронавічу Левіну.**

А пасля зноў пытанні. Яны розныя і хвалюючыя, лёгкія і складаныя. І зноў адказвае Л. М. Тамільчык.

Не выпадкова закранута і пытанне аб скорасці. У апошні час мы з'яўляемся сведкамі дыскусій, якія вядуцца буйнейшымі вучонымі на старонках газет і часопісаў, у якіх усё больш акрэслена выказваецца смелая думка пераадолець «светавы бар'ер». Сапраўды, ці можа быць скорасць вышэй скорасці света?..

Такія пытанні, як і адказы на іх, безумоўна, азначаюць глыбокую зацікаўленасць студэнтаў да стану сучаснай навукі.

Дадзены адказы на асноўныя пытанні. А за імі пайшлі дадатковыя, у вуснай і пісьмовай форме. Чым далей—тым больш ажыўлялася зала. Спрэчкі пачалі разгарацца паміж самімі студэнтамі. Ім не было канца і тады, калі вечар закончыўся. Яны працягваліся па інерцыі ў пакоях інтэрната... Нараджалася ісціна...

Сёння студэнты, што жывуць у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова, чакаюць новага вечара, а з імі новых адказаў на новыя хвалюючыя пытанні, якія паўсядзённа ставіць жыццё.

**А. СВОРАБ.**

**На здымках:** Адказвае на пытанні доктар філасофскіх навук Р. А. Левін; у зале няма раўнадушных (справа).

## ІСЦІНА НАРАДЖАЕЦЦА Ў СПРЭЧКАХ

Выхаванне студэнтаў і фарміраванне іх светапогляду— складаны, дынамічны, шматгранны працэс, які ўключае ў сябе не толькі вучэбны цыкл, але і цэлую сістэму пазалекцыйных мерапрыемстваў. Формы і метады пазавучэбнай выхаваўчай работы выключна разнастайныя. Нам хочацца спыніцца толькі на адной з іх — правядзенні вечароў пытанняў і адказаў і падзяліцца некаторымі назіраннямі агульнага характару.

Наша кафедра ў супрацоўніцтве з выкладчыкамі іншых кафедр на працягу трох апошніх год рэгулярна праводзіла вечары пытанняў і адказаў у інтэрнаце студэнтаў хімічнага і геаграфічнага факультэтаў. Так, у 1966—1967 і 1967—1968 навучальных гадах, побач з іншымі мерапрыемствамі, было праведзена чатыры такіх вечары, на якіх было атрымана каля 70 пытанняў і прысутнічала больш 200 чалавек. Вось некаторыя з пытанняў: 1) аб спецыфіцы атэістычнага пазнання рэчаіснасці; 2) аб каханні і сяброўстве; 3) аб развіцці філасофскай навукі ў нашай краіне; 4) аб падзеях у Кітаі; 5) аб культурных пераўтварэннях у Сірыі; 6) аб лёсе Глезаса і Мікіса Тэадаракіса; 7) што такое дэвальвацыя фунта стэрлінгаў; 8) аб становішчы савецкай генетыкі; 10) што такое эўрыстыка; 11) аб тэорыі рэзананса; 12) аб дасягненнях кібернетыкі і г. д.

Колькасць пытанняў, іх характар і тэматыка заслугоўваюць належнай увагі і сур'ёзнага аналізу ў розных аспектах.

Некаторыя прыхільны сцвярджаць, што студэнты-прыродазнаўцы імкнуцца абмежаваць кола сваіх інтарэсаў спецыяльнымі галінамі. Аднак аналіз паступіўшых пытанняў дае магчымасць сказаць, што гэта далёка не так. Насупраць, кола гэтых інтарэсаў настолькі шырокае, што ахоплівае пытанні грамадска-палітычнага, філасофскага, прыродазнаўча - навуковага, этычнага і эстэтычнага характару. Інакш кажучы, кожная падзея, якая адбываецца ва ўнутраным і міжнародным жыцці, у навуковай і культурнай галінах знаходзіць жывы водгук у студэнцкім асяроддзі. А ён, у сваю чаргу, суправаджаецца жаданнем і спробамі студэнтаў пазнаць сутнасць падзей або з'яў і вызначыць да іх свае адносіны.

Колькасць і характар зададзеных пытанняў заўважальны і ў другіх адносінах, а іменна, яны ў пэўнай меры служаць паказчыкам грамадска-палітычнай і навуковай актыўнасці студэнтаў, іх тэарэтычнай падрыхтоўкі. Аб гэтым сведчаць пастаўленыя не толькі асноўныя, але і дадатковыя пытанні, якія вызначаюцца спеласцю сваёй пастаноўкі. Напрыклад, у якасці дадатковых пытанняў былі зададзены такія: «Наколькі плённай аказалася тэорыя сіметрыі элементарных часцінак?» або «Якія асаблівасці пераходнага перыяду ў краінах, якія здзяйсняюць пераход да сацыялізма, мінаючы капіталізм?» і г. д.

Мы дапусцілі б аднабаковасць, калі б бачылі ў правядзенні вечароў пытанняў і адказаў толькі сродак пашырэння і паглыблення ведаў студэнтаў. Гэта ў не меншай ступені сродак, які садзейнічае фарміраванню навуковых дыялектыка - матэрыялістычных поглядаў. Гэтыя два бакі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Добра вядома, што глыбокія веды асноў прыродазнаўчых і грамадскіх навук з'яўляюцца той неабходнай базай, ад якой студэнт ідзе да лагічных вывадаў і дыялектыка - матэрыялістычнага светапогляду.

Атрымліваючы кароткія, змястоўныя адказы на актуальныя пытанні развіцця фізікі, хіміі, кібернетыкі, навуковага камунізма і іншых навук, студэнты так ці інакш знаходзяць падцвярджэнне правільнасці прынцыпаў дыялектычнага матэрыялізму аб матэрыяльнасці свету і яго пазнавальнасці, аб узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці з'яў і прадметаў. Больш таго, такія невымушаныя размовы, дзе ў цэнтры ўвагі ставяцца актуальныя праблемы цэлага раду навук, дзе высвятляюцца пытанні складанага і супярэчлівага шляху развіцця пазнання, дапамагаюць студэнтам лепш разбірацца ў навуковых тэорыях, а з тэорый і фактаў навукі рабіць агульныя светапоглядныя вывады. Усё гэта развівае ў студэнтаў зацікаўленасць да філасофскага разумення навуковых дасягненняў, да высвятлення метадалагічных праблем сучаснай навукі, якая садзейнічае выяўленню сувязі філасофіі і прыродазнаўства.

Напрыклад, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт А. І. Ляўко, знаёмячы студэнтаў з сучаснымі тэорыямі аб паходжанні жыцця на Зямлі, падводзіў студэнтаў да самастойнага аналізу і ацэнкі новых навуковых фактаў, што арганічна збліжае з дыялектыка - матэрыялістычным разуменнем сутнасці жыцця, яго паходжання і развіцця. Высвятленне узнікшага пытання замацоўвае упэўненасць чалавека, незаўважальна садзейнічае фарміраванню тых ці іншых бакоў навуковага светапогляду.

Неабходна таксама заначыць, што ўвесь ход вечароў пытанняў і адказаў, увесь іх змест садзейнічаюць развіццю дапытлівасці, цягі да паглыблення ведаў, да самастойных пошукаў, што таксама неаддзельна ад фарміравання навуковага светапогляду. Неяк у гутарцы адзін са студэнтаў хімічнага факультэта заўважыў: «Аднойчы пасля вечара пытанняў і адказаў мы доўга спрачаліся...»

Мы не прыхільны пераацэньваць ролю такіх мерапрыемстваў у пазавучэбнай выхаваўчай рабоце. Але ўсё ж нельга не бачыць, што такая форма мае сваю перавагу.

Ю. ГУСЕЎ,
старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, кандыдат філасофскіх навук.

*ДА АГЛЯДУ НАСЦЕННАГА ДРУКУ*

# АБ ПРОСТЫМ — ЗАЙМАЛЬНА

Першы раз ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе будзе ўдзельнічаць зусім новая і самая маладая газета «Журналіст». З першых жа нумароў яна зацікавіла чытачоў. Пасля выхаду чарговага нумара каля яе збіраецца мноства студэнтаў, выкладчыкаў, лабарантаў. Чым жа прыкоўвае ўвагу гэта газета? Мастацкім афармленнем? У нейкай меры гэта так, бо газета заўсёды выдатна аформлена, добра ілюстравана. Рэдкалегія газеты стараецца падаваць матэрыялы ў іх першаснай форме, амаль без літаратурнай праўкі. І гэта ў большасці выпадкаў апраўдваецца, бо аўтар бачыць свой матэрыял такім, якім ён быў зроблены. Кожны можа сказаць аб літаратурным почырку свайго таварыша, адзначыць яго слабыя і моцныя бакі.

І не толькі гэтая своеасаблівая практыка ў «Журналісце» дапамагае будучым газетчыкам набываць вопыт, бліжэй знаёміцца са сваёй прафесіяй. У кожным нумары пад рубрыкай «Мы вучымся ў вас» друкуюцца матэрыялы аб былых выпускніках журфака, якія зараз ужо вядомыя журналісты, грамадскія і палітычныя дзеячы.

«Свет такі цудоўны» — пад гэтай рубрыкай чытачы прывыклі бачыць серыі здымкаў пачынаючых фотарэпарцёраў. Частка здымкаў Аркадзя Нікалаева і Сцяпана Супруна, студэнтаў трэцяга курса журфака, ужо друкавалася і на старонках «Беларускага універсітэта».

Газета робіцца прывабнай пры ўменні рэдакцыі пастаянна адгукацца на запатрабаванні чытачоў, паведамляць як мага больш карысных звестак, спалучаць сур'ёзнасць з выразнацю, вастрыню з прынцыповасцю. І гэта, відаць, добра вядома не толькі журналістам, але і тым здольным хлопцам і дзяўчатам з біяфака, якія робяць газету «Vita». Рэдкалегія газеты не гоніцца за вонкавай займальнасцю, затое кожны матэрыял цікава пачытаць.

Калі спытаеш у любога біёлага, ці падабаецца яму газета «Vita», то абавязкова пачуеш сцвярджальны адказ. І рэдкалегія гэта ведае, бо перад тым, як выпускаць чарговы нумар, яна заўсёды збіраецца і абмяркоўвае, як лепш і цікавей зрабіць газету, чым прывабіць свайго дапытлівага чытача. На яе старонках нярэдка з'яўляюцца апавяданні, вершы і літаратурныя замалёўкі.

У нас ва універсітэце дзевяць факультэтаў — столькі ж і насценных газет. У кожнай свой твар, свае творчыя задумы і рознае іх адлюстраванне.

Газета «Філолаг» вельмі разнастайная і цікавая сваёй тэматыкай і разнастайнасцю жанраў, але трэба зрабіць і некалькі крытычных заўваг у бок рэдкалегіі. Лічыцца немалаважным у сценгазеце — мастацкае афармленне. А яно ў «Філолага» не на ўзроўні. Афармляць газету трэба цікава і прыгожа, без усялякага мадэрнізму. Вельмі абмяжоўвае сэнсавае ўспрыйманне матэрыялаў іх размяшчэнне і друкаванне на рознакаляровай паперы, як гэта робіць рэдкалегія «Філолага».

Не прыцягваюць увагі і «сляпыя» газеты. Да ліку такіх можна аднесці газету матфака «Рашым любую задачу».

Перш-наперш газета павінна заклікаць чытачоў сваім знешнім выглядам. Дарэчы, вельмі ўжо рэдка выпускаюць сваю газету матэматыкі і юрысты.

Набліжаецца 50-годдзе БССР і КПБ. Калектыў універсітэта прыняў пачэсныя абавязацельствы. Выканаць іх будзе нялёгка і таму усе сродкі масава-палітычнай работы павінны быць падпарадкаваны гэтай мэце. І тут шырокае поле дзейнасці адкрываецца для насценных газет. Шляхам папулярызацыі ўсяго перадавога і станоўчага, прынцыповай і дзелавой крытыкі недахопаў яны могуць унесці свой уклад у ганаровую справу падрыхтоўкі да юбілею.

**П. ПАБОКА, А. САГАЎ.**



ЛЕ ТХАНЬ ХОАК ужо закончыў фізічны факультэт нашага універсітэта па спецыяльнасці «оптыка». Можна з упэўненасцю сказаць, што гады вучобы для яго не прайшлі дарма. Цяпер Хоак займаецца ў аспірантуры. З раніцы да позняга вечара яго можна бачыць у лабараторыі. Часта звяртаюцца да яго за парадамі в'етнамскія студэнты.

Калі паглядзець, колькі Ле Тхань Хоак паспявае зрабіць за суткі, цяжка паверыць, што ў іх толькі 24 гадзіны. Не так і проста паспець пазнаёміцца з падзеямі ў свеце і схадзіць на экскурсію, і прыдумаць новы варыянт пастаноўкі вопыту, і азнаёміцца з навуковай літаратурай. Несумненна, што і аспірантуру ён закончыць паспяхова.

**Ю. КАРОЛЬ,**
**студэнт пятага курса фізфака.**

На здымку **Ф. Зязюлі** вы бачыце Ле Тхань Хоака у час правядзення аднаго з вопытаў.



Пасля заканчэння хімічнага факультэта Вера Шапавалава працягвае вучобу ў аспірантуры, актыўна ўдзельнічае ў навукова-даследчай працы.

НА ЗДЫМКУ: **В. ШАПАВАЛАВА** даследуе слабыя арганічныя кіслоты.

# БЕССМЯРОТНАЕ ІМЯ

Нядаўна адбылося сумеснае пасяджэнне Вучонага савета і СНТ факультэта журналістыкі, прысвечанае стагоддзю з дня нараджэння А. М. Горкага. На пасяджэнні разглядалася публіцыстычная творчасць вялікага пісьменніка. З дакладамі па розных праблемах майстэрства Горкага-публіцыста выступілі выкладчыкі і студэнты факультэта. Ва ўступным слове дэкан факультэта дацэнт Р. В. Булацкі адзначыў велічнае значэнне Горкага для развіцця савецкай журналістыкі. Старшы выкладчык А. І. Апелінская расказала аб рабоце Горкага ў бальшавіцкіх выданнях. Студэнты А. Слука, А. Красінская, Г. Сыраежка выступілі з дакладамі аб нарысах і памфлетах Горкага, аб яго парадах пачынаючым пісьменнікам і журналістам. Тэмай выступлення дацэнта Е. Л. Бондаравай былі «Запаветы Горкага журналістам».

**В. ГУДОВІЧ.**

# *ПРА ШТО РАСКАЗАЎ МЕСЯЧНІК*

У сакавіку па ініцыятыве прафбюро і дэканата на геолага-геаграфічным факультэце прайшоў агляд-месячнік «За чысціню, вучэбную і працоўную дысцыпліну». Ён праследаваў мэту палепшыць становішча вучэбных памяшканняў, падняць дысцыпліну. Загадзя была праведзена адпаведная падрыхтоўчая работа: дадаткова вызначаны дзяжурныя выкладчыкі і студэнты, размеркаваны іх абавязкі. Кантроль за ходам агляду быў ускладзены на камсамольскае (т. Міхед) і прафсаюзнае (тав. Пракапеня) студэнцкія бюро.

Цяпер, калі агляд-месячнік ужо закончыўся, можна падвесці вынікі. Якія ж яны? На жаль, маласуцяшальныя. Стракатая ад двоек табліца, дзе выстаўлены адзнакі за прыбіранне аўдыторый. Доўгі спісак вінаватых; сярод іх першакурснікі Кудрашоў, Лісоўскі, Чарнякоў, Лапушка, Кулай і іншыя, другакурснікі Фурсікаў, Агафонаў, Барысевіч, Леус, Лявонава, Аўдзееў, студэнты трэцяга і чацвёртага курсаў Кісялёў, Заўрыеў, Покідава, Малахава, Казак... Не вызначыліся дысцыплінаванасцю курыльшчыкі. Склалася думка, што іх патрэбна выхоўваць толькі караючымі мерамі.

Агляд-месячнік прахадзіў, проста скажам, нездавальняюча, і за гэта нясуць адказнасць камсамольскае і прафсаюзнае студэнцкія бюро. Па сутнасці ён прайшоў без іх удзелу, хоць гэтыя арганізацыі павінны былі самым непасрэдным чынам накіроўваць ход месячніка і сачыць за яго вынікамі.

Не было дакладнай узаемасувязі паміж дадаткова назначанымі дзяжурнымі-выкладчыкамі і дзяжурнымі - студэнтамі. У апошнія дзесяць дзён рэдка ўдавалася знайсці дзяжурных студэнтаў. Нарукаўныя павязкі дзяжурных былі згублены ўжо ў першую палову агляду-месячніка.

Асобна трэба выдзеліць «старанне» нашых вячэрнікаў. Пасля іх заняткаў лекцыйныя памяшканні, як правіла, няўяўна засмечаны паперкамі ад цукерак, шалухой семечак. Усё гэта гаворыць аб нізкай культуры паводзін (і, відавочна, не толькі на занятках). А гэтым жа людзям трэба несці сцяг культуры, ведаў! Высока несці гэты сцяг можа толькі сапраўды культурны чалавек.

**В. ФЯДОТАЎ,**
**старшыня жылбыткамісіі прафбюро геолага-геаграфічнага факультэта.**

*ПАДКАЗАЦЬ?..*
*Фотаэцюд*
*А. СКАБКАРОВА.*



# ВОСЬМАЕ НЕБА

Не здзіўляйцеся загалоўку, восьмае неба сапраўды ёсць у нас ва універсітэце і гаспадараць на ім рэальныя людзі. У вежы галоўнага корпуса на восьмым паверсе размешчана візуальна-аптычная станцыя назірання за штучнымі спадарожнікамі зямлі. Напярэдадні Дня касманаўтыкі мы падняліся ў яе ўладанні, каб узяць невялікае інтэрв'ю ў тых, хто арганізуе службу назіранняў і гэтым уносіць свой уклад у засваенне касмічнага прастору.

Начальнік станцыі, нядаўні выпускнік фізічнага факультэта Васіль Васільевіч Далінін расказвае крыху аб гісторыі станцыі. Яшчэ да запуска першага спадарожніка зямлі Астранамічны савет АН СССР арганізаваў падрыхтоўку назіральнікаў. І ужо ў 1958 годзе наша станцыя ў ліку першых пачала дзейнічаць. А нядаўна, адзначаючы актыўны ўдзел у назіраннях за штучнымі спадарожнікамі зямлі на працягу дзесяці гадоў, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Астранамічны савет АН СССР узнагародзілі калектыў станцыі граматай.

Я прашу Васіля Васільевіча расказаць больш падрабязна аб рабоце.

— З вылічальнага цэнтра да нас паступае інфармацыя аб каардынатах і часе палёту спадарожніка. Наша задача ўдакладніць іх шляхам назіранняў. Рэзультаты паведамляем у вылічальны цэнтр.

Гэтыя весткі, якія паступаюць з розных куткоў Саюза, дзе размешчаны станцыі, падобныя на нашу, дазваляюць назіраць за змяненнямі арбіты спадарожніка з цягам часу. Ну, і дадаткова — судзіць аб шчыльнасці атмасферы, форме зямлі і г. д.

— Цяпер, — працягвае В. В. Далінін, — наша станцыя аднесена да кафедры электрафізікі, кантроль за яе работай здзяйсняе загадчык кафедры В. Г. Вафіядзі. Па яго ініцыятыве арганізаваны філіял станцыі, дзе ёсць лепшыя ўмовы для назіранняў. Цяпер там працуе студэнтка Таня Мрукала.

Сувязь станцыі з кафедрай дазваляе вырашаць многія цікавыя пытанні, у распрацоўцы якіх прымаюць удзел студэнты розных курсаў.

Інжынер Уладзімір Акімавіч Бабкоў расказвае аб тэматыцы курсавых і дыпломных работ, якія праследуюць мэту павысіць адчувальнасць прыбораў і прыстасаванняў, якія выкарыстоўваюцца для назіранняў штучнага спадарожніка зямлі.

Мы дзякуем за гутарку і пакідаем восьмае неба з пачуццём добрай зайздрасці да яго гаспадароў.

**А. НІКОЛЕНКА.**



НА ДАРОГАХ БЕЛАРУСІ. Фота **І. Аскіркі.**

# ТВОРЧАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

## ВЯЧЭРНІКІ СМЯЮЦЦА...

*(Гісторыкі шостага курса аб сабе)*

### ВЕРА А.

То ласкамі, то казкамі,
Ухілкамі, намёкамі,
Не ведамі глыбокімі
Бяру прафесароў,
А броскаю прычоскаю,
Усмешкаю прывабнаю
Прафесара прываблю я,
Ён здасца, будзь здароў!

### ТОНЯ Ж.

Я з тых, аб кім пісаў
Някрасаў,
Што спыніць на скаку
каня,
Перад экзаменамі ж часам
Дрыжу — спакою мне
няма.
Я не вучу — зубру
звычайна,
Аднак жа сэрца — ёк ды
ёк,
Так б'ецца моцна і
адчайна,
Пайду, шчэ падзубру урок.

### ВАЛЕРА К.

На чацвёркі і пяцёркі
Надакучыла вучыцца.
Не хачу над кніжкай
біцца,
Гэты лёс — нялёгкі, горкі.
Малады я хлопец, бойкі,
Мне б вучыцца на
выдатна,
Я ж на гэта ўжо не
здатны.
Я — вячэрнік, хопіць
тройкі.

### АНЯ С.

Усе выкладчыкі дачыста
Мне знаёмы асабіста:
Правяду да дэканата,
А, магчыма, і да хаты.
Так знаёмячыся з кожным,
Я сабе рыхтую базу.
І таму, сказаць тут
можна,
Двоек не было ні разу.

### ТАНЯ Н.

Не рабіце мне заўвагі,
Патрабую я павагі.
Мне прафесара баяцца?
Лепей буду з ім
спрачацца.
Усім грублю — і што
такое?
(Хоць няма на то
прычыны).
І забылася даўно я,
Што не хлопец я,
дзяўчына.

### ЯША Н.

Я — не прастак. Я хітры
вельмі
І не сябрую з прастакамі.
Мяне, як і Макіявелі,
Не возьмеш голымі
рукамі.
Я беражлівы, не як нехта:
Не дам, хай дойдзе хоць
да драмы,
Вам пасля лекцыі —
канспекта,
Перад экзаменам —
праграмы.

### ВАЛЯ Р.

Гаварыць люблю нямала,
Да гульні я аж гару.
Здам экзамен як папала,
А вось плёткі ўсе збяру.
Раскажу, што дзе пачую,
Хто сказаў што пра каго.
Я нікольні не бядую
Ад характару свайго.

**М. ВЯРШЫНІН.**

## НАДДЗВІНСКАЯ СУСТРЭЧА

У ТЭЛЕФОННАЙ трубцы нешта трэснула, зашыпела, віхрам уварвалася музыка, нечае таропкае распараджэнне, і сярод гэтага шуму да майго вуха данёсся знаёмы нізкі чуць хрыпаваты бас:

— Дайнека слухае...

А праз гадзіну мы ўжо ідзем з ім па гулкаму наддзвінскаму масту і гутарым. Дакладней, перабіваем адзін другога...

— А ведаеш?.. А памятаеш?..

Не было, бадай, на курсе студэнта-актывіста, хто б не лічыў сваім абавязкам пры сустрэчы з Лявонам даць яму тэрміновае даручэнне.

— Лёня! Вось так патрэбны вершы,— далонь з хуткасю маланкі слізгае па горлу...

— Надзея на цябе, дружа. Разумееш, твой голас. Словам, няма без цябе хору...

— Як камсамолец, ты абавязан...

— Як здольны студэнт, ты...

І не было, бадай, на курсе студэнта, якому б калі-небудзь даручэнне даў сам Лявон.

— Такі ўжо лёс,— жартаўліва разводзіў рукамі Дайнека, і ў яго вуснах блукала лагодная ўсмешка.

...Нашы пылкія ўражанні крыху прытухлі, размова цячэ больш стрымана, памяркоўна, як і крокі Лявона: нетаропкія, цвёрдыя.

— Ці цяжка, пытаеш? І трохі счакаўшы, разважліва гаворыць:

— Наогул, нялёгка. Тэлебачанне — гэта тэмп. Толькі зараз і толькі галоўнае.

Вочы Лявона загараюцца. Энергічны ўзмах рук.

— І ведаеш, гэта цікава. У звычайнай мітусні, у гэтым «давай-давай» неяк глыбей адчуваеш біццё жыцця, робішся сведкаю імклівых праяў яго, прыемных зрухаў, зладжанасці... Не вельмі папулярна, а? — І сцішыўшы крок, працягвае:

— Сам ведаеш. Ва універсітэце спецыяльнай падрыхтоўкі не было. Давозіцца на месцы перaладжавацца. Усё ж рэдактар. Да таго ж рэдакцыя такая — маладзёжная. Дарэчы, сёння мая перадача. Радавая — а колькі турбот!

...Адпенілася піва ў фужэрах. Чыстае стала, медназвоннае... як добры ўспамін.

Апаленыя казахстанскім сонцам, узмужнелыя і стомленыя ад'язджалі мы дамоў, у Мінск. Скончыўся працоўны семестр пабудаванымі кашарамі, майстэрнямі, школамі; незлічонымі кроплямі пота.., цудоўнымі вершамі...

Итак, до встрчи, Азия.
Прощай,
Спасибо за улыбки и
печали.
В последний раз мы пьём
твой жёлтый чай
И балагурим на твоём
вокзале...

Голас у Лявона нягучны. І постаць яго не кідкая. І стаіць ён не за трыбунай, а на гарачай пыльнай зямлі, каля Уральскага вакзала. А толькі чамусцы ўсталявалася цішыня, слухаюць і студэнты, і старыя казахі, і ў многіх раптам засвярбелі вочы, нешта моцна падобнае на смутак кранула душу...

Ещё не раз в пути
приснится нам
Безбрежный край над
водами Урала,
Где день горяч, где
хлеб зовётся нан,
Где так степенны речи
аксакалов...

Не пішу цяпер. Часова, вядома, і, пакруціўшы пальцамі фужэр, нечакана паведамляе.

— Нядаўна былі ў саўгасе «Бабанічы». Пад Оршай. Рыхтавалі матэрыял аб моладзі. І вось уяві: дырэктар саўгаса—твая аднагодка. Равесніца кіруе гаспадаркай. І трэба сказаць, удала... Глянуўшы на мяне, працягвае:

— Канешне, гэта не такі ўжо і цуд...

Але ж... Моладзь... час... ты... Узнікае шмат пытанняў, і на большасць з іх павінен адказаць сам. Асабіста. І не тое, што павінен... Абавязан... Дэкларатыўна, а?

Мы развітваемся, але Лявон яшчэ доўга стаіць у маіх вачах, і я чую яго голас:

— ...І не тое, што павінен... Абавязан... Дэкларатыўна, а?

**В. ПОЛЯК,**
**студэнт-завочнік.**
**г. Віцебск.**



*ВЯСНА.* *ФОТА І. АСКІРКІ.*

# НА СПАРТЫЎНЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

## ВАЛЕЙБОЛ

Восем каманд вышэйшых навучальных устаноў Беларусі І групы змагаюцца за званне мацнейшай. Зборная мужчынская каманда універсітэта сустрэлася з валейбалістамі Віцебскага медыцынскага інстытута і Гомельскага педагагічнага інстытута.

Гэтыя ігры закончыліся лёгкімі перамогамі нашых хлопцаў. Перамаглі і дзяўчаты.

У трэцім туры асноўнымі канкурэнтамі на прызавыя месцы былі валейбалісты ІФК і універсітэта. Нашы рабяты змаглі выіграць толькі адну партыю. Крыўднае паражэнне, тым больш, што ў іграх першынства горада нашы спартсмены перамаглі сваіх моцных сапернікаў.

Вельмі напружана праходзіла ігра жаночых каманд. У абодвух калектывах ёсць свае лепшыя ігракі. У камандзе ІФК — Н. Харытонава, Т. Ярмоленка. Нашы дзяўчаты ўскладаюць надзеі на Н. Савачкіну і Л. Антонаву. Пачатак ігры склаўся няўдачна для нашых дзяўчат. Яны не могуць закрыць блокам лідэраў атак студэнтак ІФК, да таго ж нашы саперніцы самаахдана іграюць у абароне. Гэта іх козыр, таму што ў ігры над сеткай яны ўступаюць нашым дзяўчатам.

Пасля трох партый мы вядзём 2:1. Аднак некалькі памылак зводзяць на нішто намаганні ўсёй каманды. Чацвёртая партыя праіграна —2:2. У рашаючай пятай партыі нашы дзяўчаты паспяхова бяруць старт. Яны вядуць 9:1. Цаной вялікіх намаганняў спартсменак ІФК лік становіцца 12:9. Аднак нашы дзяўчаты нагатове і даводзяць партыю да пераможнага канца. Цяжкая перамога. Фактычна яна вырашыла лёс першага месца. Але спаборніцтвы працягваюцца, і наперадзе могуць быць розныя нечаканасці.

## ФЕХТАВАННЕ

Закончылася першынство па фехтаванню сярод вну рэспублікі. Каманда універсітэта выступала ў больш слабым саставе ў параўнанні з мінулым годам, таму што закончылі універсітэт майстры спорта А. Фёдараў, І. Гарбар, моцныя першаразраднікі Г. Станкевіч, В. Казлоў, Р. Патапенка, Н. Касцюкевіч. Прыйшлося выстаўляць за каманду менш тытулаваных спартсменаў.

У асабістых спаборніцтвах паспяхова выступіла выкладчык кафедры фізвыхавання і спорта майстар спорта міжнароднага класа Святлана Салдатава, якая заняла першае месца па рапіры. Усе астатнія ўдзельнікі не маглі прабіцца ў фінал.

У камандным першынстве мужчыны-рапірысты занялі трэцяе месца (майстар спорта Ліўшыц, кандыдат у майстры Ксенафонтаў і Паўлоўскі), каманда жанчын у саставе майстра спорту міжнароднага класа Салдатавай, Петуховай і Васючковай таксама была трэцяй. Шпажысты Нечыпурэнка, Яско, Сосенка занялі чацвёртае месца. Шаблісты майстры спорта Рабчыкаў, Шадскі і Барысаў не змаглі падняцца вышэй пятага месца.

У цэлым каманда універсітэта заняла трэцяе месца, прапусціўшы наперад Інстытут фізічнай культуры і Гомельскі педагагічны інстытут.

## ПЛАВАННЕ

У саставе зборнай каманды СДСТ «Буравеснік» на першынстве БССР па плаванню сярод спартыўных таварыстваў выступалі студэнты універсітэта майстар спорта Л. Дзегцярова, майстар спорта Ю. Гарадзецкі, кандыдат у майстры спорта В. Падольскі, першаразраднікі А. Міхайлава і А. Клепацкі. У мінулым годзе студэнцкае таварыства было на апошнім месцы. У гэтым першынстве яно выйшла на другое месца, пасля ДСТ «Спартак».

Усе студэнты універсітэта, якія выступалі ў складзе зборнай каманды СДСТ «Буравеснік», занялі прызавыя месцы. Цяпер зборны калектыў плаўцоў універсітэта рыхтуецца да першынства горада сярод вну, якое адбудзецца 20—21 красавіка.

**В. СОБАЛЕВА,**
выкладчык кафедры фізвыхавання і спорта.

## АДГАДАЛІ?

АДКАЗЫ НА КРАСВОРД, змешчаны ў газеце № 11 ад 22 сакавіка.

**ПО ВЕРТИКАЛИ:**

1. Пинок. 2. Колесо. 3. Молоко. 4. Аргус. 5. Университет. 6. Осциллограф. 7. Самум. 8. Оскал. 9. Бор. 10. Комод. 11. Фул. 12. Водка. 13. Оракул. 14. Еретик. 15. Орган.

**ПО ГОРИЗОНТАЛИ:**

1. Эпигон. 2. Доклад. 3. Теремок. 4. Индикатор. 5. Полиспаст. 6. Халва. 7. СНО. 8. «Оза». 9. Пират. 10. Дыра. 11. Миф. 12. Ром. 13. Клоп. 14. Оргия. 15. Мел. 16. Сид. 17. Эгида. 18. Телевизор. 19. Термостат. 20. Кабинет. 21. Караул. 22. Сирена.

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

АТ 02157 Зак. 612. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**